*У. К. Зяневіч*

# ФАЛЬКЛОР У КАНТЭКСЦЕ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ МУЗЫКІ (з вопыту 20-х гг. ХХ ст.)

Сучасны стан гуманітарных ведаў, якія даследуюць з'явы мастацкай культуры і творчасці, характарызуецца інтэнсіфікацыяй працэсаў дыферэнцыяцыі і інтэграцыі навук. У галінах культуралогіі, эстэтычнай думкі і мастацтвазнаўства гэта знаходзіць адлюстраванне ў засваенні «новых тэрыторый», вылучэнні шэрагу праблем у якасці самастойных навуковых кірункаў, у размежаванні (пры безумоўным уліку суадносін гістарычнага і лагічнага, эмпірычнага і тэарэтычнага ў навуковым пазнанні) уласна тэарэтычных і гістарычных аспектаў. Адначасова назіраецца тэндэнцыя сустрэчнага руху – усё больш цеснае ўзаемадзеянне культуралогіі, дэдуктыўнай філасофскай эстэтыкі, з аднаго боку, і аналітычнага мастацтвазнаўства і этнамузыкалогіі – з другога.

Пытанні музычнага фальклору ў кантэксце сучаснай культуры паступова становяцца прадметам такога комплекснага разгляду. Выпрацоўваецца паняційная пэўнасць і канкрэтызацыя наяўных у навуковай літаратуры агульных канцэптаў «традыцыя», «фальклор», «этнас», узнікаюць новыя кірункі ў галіне этнамузыкалогіі [4, с.8–11].

Практычны аспект праблемы складаецца ў азначэнні наяўных формаў існавання музычнага фальклору ў сучасных умовах, а таксама ў праектаванні магчымых механізмаў аптымізацыі яго існавання.

Што ёсць фальклор для сучаснай культуры? Якая яго функцыя ў глабалізаваным грамадстве? Як захаваць, пераняць і перадаць нашчадкам скарбы нацыянальнага духу? – вось тыя пытанні, роздум над якімі выводзіць нас на гісторыка-культурныя паралелі. Вопыт мастацкай практыкі 20-х гг. ХХ ст. дае магчымасці лепш зразумець сучасныя мастацка-культурныя працэсы, знайсці аптымальныя шляхі ў вырашэнні складаных праблем сучаснай культуры.

Нацыянальнае культурнае адраджэнне, пад сцягам якога працякала мастацкае жыццё Беларусі 1920-х гг., высунула ў практычную плоскасць тэму айчыннай духоўнай спадчыны, і ў прыватнасці такога важнага яе элемента, як мастацкая народная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасць. Для народа, які шукаў шляхі нацыянальнай годнасці і самасцвярджэння, які паставіў перад сабой задачу актыўна ўключыцца ў еўрапейскі культурны кантэкст, адносіны да фальклору набывалі асаблівую актуальнасць, а іх вырашэнне станавілася значнай мастацка-эстэтычнай праблемай. У 1920-я гг., як і ў ранейшыя перыяды абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў у XIX – пачатку XX ст., узнікала вострая патрэба на розных узроўнях асэнсаваць ролю і значэнне нацыянальнага фальклору як феномена культуры.

Тэарэтычная і практычная дзейнасць беларускіх музыкантаў, фальклarystаў, крытыкаў і публіцыстаў у гэты перыяд не дыферэнцыравалася. Яна падпарадкоўвалася агульным задачам: трэба было сфакусіраваць увагу грамадскасці на праблемах адраджэння нацыянальнай культуры, паўней разгарнуць і скарыстаць патэнцыял мастацкай айчыннай спадчыны, надаць дадатковы імпульс працэсу станаўлення прафесійнага музычнага мастацтва ў Савецкай Беларусі. Адмысловая роля ў вырашэнні гэтых задач адводзілася прапагандзе народнай творчасці як найважнейшай часткі нацыянальнай мастацкай спадчыны, крыніцы і падмурку, на якіх павінны былі ўзнікнуць новыя музычна-культурныя вартасці.

1920-я гг. – час актыўнай працы па збіранні, сістэматызацыі і даследаванні ўзораў нацыянальнага фальклору: выдаюцца фальклорныя зборнікі [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7], ствараецца калекцыя традыцыйных беларускіх народных інструментаў. Фальклор уваходзіць у музычны побыт беларускіх гарадоў, уводзіцца ў рэпертуар выканальніцкіх калектываў, выкарыстоўваецца ў вучэбных праграмах агульнаадукацыйных школ і музычных вучэбных устаноў. Народны музычны матэрыял інтэнсіўна распрацоўваюць у сваіх творах кампазітары Беларусі. Грамадская функцыя музычнага фальклору паступова набывае новыя якасці: замкнёная сялянская культура «сама ў сабе», носьбіт нацыянальнага субстрату, становіцца культурай, адчыненай для ўсіх, фактарам, які злучае народ і фарміруе нацыю.

Увага да праблем фальклору ў кантэксце беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння стала адной з сутнасных характарыстак музычна-эстэтычнай думкі Беларусі 1920-х гг. Музычны фальклор даследуецца ў праблемных артыкулах, яму прысвячаюцца нарысы, палемічныя выступленні. Гэтая, вобразна кажучы, «фальклорная хваля», якая трывала ўтрымлівала пазіцыі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай музычнай крытыцы і публіцыстыцы, сведчыла пра тое, што мастацкая народная творчасць усведамлялася тагачаснай грамадскасцю ў якасці фундаментальнай каштоўнасці, асноватворнага сацыяльна-культурнага феномена. У гэты перыяд фальклор стаў прыметнай з'явай культурнага жыцця Беларусі, фактам індывідуальнай і грамадскай свядомасці, што ў своеасаблівай форме адлюстроўвалі культурныя арыентацыі розных сацыяльных і нацыянальных груп яе насельнікаў.

Звяртаючыся да праблемы народнай творчасці, беларуская музычная крытыка і публіцыстыка, у адпаведнасці з рамантызмам культурна-адраджэнскага руху 20-х гг., галоўную ўвагу канцэнтравала на агульным ідэйна-эстэтычным асэнсаванні фальклору ў адзінстве сацыяльна-палітычнага, маральна-этычнага і мастацкага аспектаў. Такі, у пэўным сэнсе сінкрэтычны, цэласны падыход, нягледзячы на яго абмежаванасць, меў свае пазітыўныя бакі. Фальклор разглядаўся як выяўленне нацыянальнай годнасці, з пункту гледжання яго сацыяльнай значнасці, эстэтычных асаблівасцей і мастацкіх магчымасцей. Народная мастацкая творчасць успрымалася грамадскай думкай у якасці самабытнага грамадска-культурнага феномена, нацыянальнага здабытку, якія з'яўляюцца крыніцай каштоўнага сацыяльнага, эстэтычнага і маральна-этычнага вопыту. Ідэалы нацыянальнага адраджэння высоўвалі на першы план разуменне фальклору як фактару, які мае «вялікую вартасць для захавання і развіцця культуры» [6, с.5].

Уласцівая музычнай крытыцы і публіцыстыцы гэтага перыяду цікавасць да феномену творчасці, прызнанне грамадскай каштоўнасці таленту, здольнасцей да мастацкага асэнсавання рэчаіснасці, разуменне асобай ролі музыкі ў сістэме мастацтваў – усё гэта вымушала пільна вывучаць фальклор, шукаць у ім адказы на традыцыйныя для нацыянальнай эстэтычнай свядомасці пытанні.

Адметнасцю музычна-эстэтычнай думкі 1920-х гг. было своеасаблівае спалучэнне рэнесанснага, культурна-асветніцкага характару мастацкай крытыкі і публіцыстыкі, уласна музычна-эстэтычнай праблематыкі. Рамантычныя ўяўленні аб нацыянальнай культуры беларусаў як аб гісторыі драматычных суадносін рэальнага і ідэальнага, магчымага і рэчаіснага перапляталіся з рэалістычнымі падыходамі да ажыццяўлення нацыянальнага ідэалу. Народнае мастацтва, фальклор асэнсоўваліся як важнейшы аспект

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнага быцця, сапраўды нацыянальная форма творчай дзейнасці.

1920-я гг. сталі часам паступовага асэнсавання народнай творчасці як асобай эстэтычнай сістэмы, у якой заключаны, кажучы сучаснай мовай, «генетычны код» нацыянальнага музычнага мыслення. Выспявае разуменне, што гэтая сістэма з прычыны сваіх іманентных, унутрана ўласцівых ёй асаблівасцей і характарыстак аказвае ўздзеянне на прафесійную мастацкую творчасць, праграмуе шляхі яе развіцця, бо фальклор, у адпаведнасці са сваёй сутнасцю, акумулюе ў сабе і рэгенеруе найбольш глыбінныя, устойлівыя рысы і асаблівасці нацыянальнага светаўспрымання, уласцівыя дадзенаму народу. Фальклор, які разам з мовай непарыўна звязаны з матэрыяльным і духоўным жыццём народа, канцэнтруе ў сабе рысы, прыметы і ўласцівасці, характэрныя менавіта для дадзенага тыпу мастацкага мыслення. Такім чынам, як форма мастацкага самавыяўлення народа фальклор выступае ў якасці крытэрыю нацыянальнага ў мастацтве, з'яўляецца субстратам нацыянальна-характэрнага ў музычным мастацтве. Музычны фальклор асэнсоўваўся як інтанацыйна-семантычнае асяроддзе, якое забяспечвае гарманічнае развіццё прафесійнай нацыянальнай музычнай творчасці.

Традыцыйная мастацкая творчасць і выхаваная ва ўлонні фальклору прафесійная беларуская музыка 1920-х гг. заклалі тэндэнцыі далейшага развіцця беларускай музычнай культуры, сталі фактарам, які спрыяў фарміраванню і рэгенерацыі нацыянальнага ў псіхалогіі і побыце гарадскога насельніцтва Беларусі, а паняцце «фальклор» становіцца адной з цэнтральных катэгорый нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі гэтага перыяду.

1. *Гарэцкі, М.* Народныя песьні з мэлёдыямі / М. Гарэцкі, А. Ягораў. – Менск, 1928. – № 20.

2. *Грыневіч, А.* Навука спеву (правілы і практыка) / А. Грыневіч. – Вільня, 1923.

3. *Зьбіранне* і апрацоўка фольклёру: даклад т. Гарэцкага // Працы Першага ўсебеларускага краязнаўчага зьезду. 7–11 лютага 1926 году. – Менск, 1926. – С. 56.

4. *Мацієўскі, І.* Кагнітыўная музыкалогія як навука XXI стагоддзя / І. Мацієўскі // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання. – Мінск: БДУКМ, 2010. – С. 8–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Праграма-інструкцыя* для зьбіральніка беларускай музычна-этнаграфічнай творчасьці / апрацована сэкрэтаром песеннай камісіі ІБК А. Грыневічам // Наш край. – 1925. – № 1.

6. *Тэраўскі, У.* Беларускі лірнік / У. Тэраўскі. – Берлін, 1922. – 99 узораў.

7. *Тэраўскі, У.* Беларускі сьпеўнік з нотамі на тры галасы паводле народных мэлёдыяў / У. Тэраўскі. – Менск, 1921. – 25 узораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ